УДК [667.16:687.112](476)

***А. А. Юковіч (Хадкевіч),***
*выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Рэспубліка Беларусь*

# ЗАХАВАННЕ І ТРАНСЛЯЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА БЕЛАРУСКАГА КАСЦЮМА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца беларускі нацыянальны строй у кантэксце сучасных інтэрпрэтацый. Дадзеная праблема з'яўляецца актуальнай, паколькі адзенне заўсёды было і застаецца неаддзельнай часткай культуры грамадства, а таму служыць неабходным атрыбутам пры вывучэнні гісторыі народа, яго абрадаў і звычаяў. Нацыянальны касцюм, як аўтэнтычны, так і сучасны, выступае спосабам выказвання ідэнтычнасці беларускага народа. Артыкул прысвечаны аналізу сучасных метадаў выкарыстання народнага касцюма ў постфальклорным (беларускі фолк-гурт «Гуда» («Guda»), сцэнічным (дызайнер Н. В. Смаляк, вобразы ансамбля танца, музыкі і песні «Талака») і этнічным (брэнд «Eglit») стылях. У поліэтнічнай прасторы Беларусі тэндэнцыя выкарыстання культурных традыцый народнага касцюма імкліва набірае абароты. Сучасная эпоха становіцца ўніверсальным механізмам трансляцый культурнага досведу Беларусі: яна перадае каштоўнасці, нормы і ідэалы.

**Ключавыя словы:** традыцыйны строй, этна-стыль, фальклорнае мастацтва, постфальклорны стыль, сцэнічны касцюм, мастак-мадэльер.

***A. Yukovich (Khadkevich),***
*Lecturer at the Department of Arts and Crafts*
*of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Republic of Belarus*

# PRESERVATION AND BROADCASTING OF THE NATIONAL BELARUSIAN COSTUME IN MODERN CONDITIONS

**Abstract.** The article considers the Belarusian national system in the context of modern interpretations. This problem is relevant because clothing has always been and remains an integral part of the culture of society, and therefore serves as a necessary attribute in the study of the ethnic history of the people, its rites and customs. The national costume, both authentic and modern, is a way of expressing the identity of the Belarusian people. The

article is devoted to a careful analysis of modern methods of using folk costumes in post-folklore (Belarusian folk group «Guda»), stage (designer N. V. Smalak, images of dance, music and song ensemble «Talaka») and ethnic (brand « Eglit») style. In the polyethnic space of Belarus, the tendency to use the cultural traditions of folk costume is rapidly gaining momentum. The modern era is becoming a universal mechanism for broadcasting the cultural experience of Belarus: it transmits values, norms and ideals.

**Keywords:** traditional outfit, ethnic style, folk art, post-folk style, stage costume, fashion designer.

Традыцыйны беларускі строй – унікальны помнік матэрыяльнай і духоўнай культуры, на працягу гісторыі ён мадыфікаваўся, развіваўся, прыстасоўваўся да новых павеваў жыцця і яго носьбітаў. Беларускі нацыянальны касцюм – комплекс адзення, абутку і аксесуараў, які выкарыстоўваўся беларусамі ў паўсядзённым і святочным ужытку [2]. «За эталон нацыянальнага беларускага косцюма прыняты сёння тыя рэгіянальныя формы сялянскіх і местачковых строяў (комплексаў адзення), якія бытавалі на тэрыторыі Беларусі на мяжы XIX–XX стст.» [3]. Класічны варыянт традыцыйнага касцюма ўключае арнамент, які з’яўляецца не толькі аздабленнем, але і элементам сімвалічнага сэнсу.

Канцэпцыю традыцыйнага беларускага сучаснага касцюма складаюць постфальклорны, сцэнічны і этнічны стыль. Аснову постфальклорнага касцюма ўтварае народнае мастацтва, ідэнтыфікуючы вобраз у цэлым, звяртаючыся да традыцый і тэхналогій вырабу, а таксама выкарыстоўваючы каляровыя расфарбоўкі, асаблівасці пашыву, улічваючы рэгіянальную своеасаблівасць матываў. Актывізацыя фальклорнага мастацтва і этнічнай самасвядомасці ў эпоху дамінавання высокіх тэхналогій – адзін з найважнейшых шляхоў развіцця сучаснага грамадства. Постфальклорны рух пачынаючы з 1960-х гг. адраджае народныя строі, танцы, святы, абрады і працягвае актыўнае функцыянаванне ў цяперашні час. Яскравым прадстаўніком постфальклорнага касцюма і музычнага мастацтва з’яўляецца беларускі фольк-гурт «Гуда» («Guda»). Ён быў заснаваны ў 1996 г. як цэнтр эксперыментальных даследаванняў у галіне архаічнай пеўчай спадчыны, сабранай падчас экспедыцый [5]. Касцюмы для выступлення пашыты ўручную па этнаграфічных звестках (апісаннях, фотаздымках) і адпавядаюць гісторыка-

культурнаму рэгіёну, з якога родам артыст. Спецыфіка касцюмаў гурту застаецца нязменнай і блізкай да аўтэнтычнага народнага строя.

Разуменне візуальнага ўзнаўлення нацыянальнага касцюма ў сучаснага чалавека складаецца пад уздзеяннем сцэнічнага вобраза. Мастакі-мадэльеры творча абагульняюць, стылізуюць, перапрацоўваюць і ствараюць аўтарскія сцэнічныя вобразы, выбарачна фіксуючы асноўныя характарыстыкі этнічнай першаасновы. Арнаментальныя матывы ўзмацняюцца дэкаратыўнасцю дэталяў: павялічваецца памер вышыўкі, часта ўводзіцца аздабленне са стужкі, стразаў і пацерак. Для маштабнай візуалізацыі ўзмацняецца фармат адлюстравання, які выконваецца дзякуючы машынным тэхналогіям, радзей уручную. Для вырабаў выкарыстоўваюцца пераважна прамысловыя тканіны. Яны валодаюць такімі ўласцівасцямі, як нясмінальнасць, гіграскапічнасць, паветрапранікальнасць, эластычнасць, і ў той жа час імітуюць традыцыйныя тканіны, якія выкарыстоўваліся пры стварэнні аўтэнтычных народных строяў. Пры выбары матэрыялаў улічваецца перадача колеру і фактур тканіны ў залежнасці ад абсталявання сцэны, бо пры штучным асвятленні шматлікія тканіны могуць успрымацца інакш. Сцэнічны стыль найбольш часта сустракаецца ў народнай харэаграфіі, дзе народны строй выступае адным з самых яскравых выразных сродкаў беларускага народа і з’яўляецца паказчыкам нацыянальных традыцый.

Беларускі мадэльер і дызайнер Н. В. Смаляк вылучае ў сваіх аўтарскіх калекцыях сцэнічныя вобразы для калектываў, якія працуюць у тэатральным, музычным, харэаграфічным мастацтве. Наталля Віктараўна з’яўляецца членам Беларускага саюза мастакоў, лаўрэатам і дыпламантам рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў, удзельніцай больш як 35 мастацкіх выставак, якія праходзілі ў Беларусі і па-за яе межамі (Польшча, Літва, Расія), аўтарам 6 персанальных арт-праектаў [6]. У творчасці Н. В. Смаляк выкарыстоўвае мастацкі падыход да вывучэння эстэтычнага і эмацыянальнага складальніка беларускага народнага касцюма, фіксуе вопыт нацыянальнай спадчыны, пераасэнсоўваючы яго праз аўтарскае бачанне. Звяртаючыся да эстэтычных кодаў мінулага і выкарыстоўваючы традыцыйныя тэхнікі – ручное ткацтва, аплікацыю,

вышыўку, аўтар стварае сучасны касцюм, якому ўласцівыя ўнікальная структура формы і сцэнічная вобразнасць.

У 2009 г. мадэльерам Н. В. Смаляк былі створаны, распрацаваны і рэалізаваны сцэнічныя касцюмы для выступленняў ансамбля танца, музыкі і песні «Талака». У аснове харэаграфічнай праграмы калектыву – народна-сцэнічныя танцы рэгіёнаў Беларусі, розныя па сваіх традыцыях, малюнку, манеры выканання, каларыту касцюмаў («Ручнікі», «Вальс», «Кола») [1].

Сцэнічныя вобразы вырашаны ў арыгінальнай аўтарскай манеры, з тонкай распрацоўкай каляровых суадносін, выкарыстаннем дэкору, гарманічнымі суадносінамі аб'ёму і формы. Эстэтыка народных строяў закладваецца ў аснову для стварэння сцэнічных вобразаў. Кожны касцюм уяўляе сабой унікальнае спалучэнне тэхнічных адкрыццяў, аўтарскага бачання, эмацыянальнага і эстэтычнага поля, гэта прадмет шматузроўневага дыялогу паміж мінулым і будучым, спадчынай і сучаснасцю, традыцыямі і новаўвядзеннямі.

У этнічным стылі камплекты адзення ўзнаўляюць пэўныя характэрныя рысы нацыянальнага касцюма народа (этнасу) [4]. Трыумфальная папулярнасць этна-стылю на сусветных подыумах назіраецца з 1970-х гг. і да нашага часу. Беларускі традыцыйны касцюм – бязмежная крыніца натхнення, з дапамогай якой сучасныя дызайнеры ствараюць яркія, арыгінальныя і самабытныя вобразы ў этнічным стылі. Абліччы будуюцца за кошт выкарыстання нацыянальных арнаментаў, каляровых спалучэнняў, натуральных матэрыялаў, незвычайных канструктыўных форм, традыцыйных тэхнік.

Брэнд «Eglit» беларускага дызайнера Г. М. Эгліт спецыялізуецца на вырабе адзення ў этнічным стылі. Праца пачынаецца ў эскізных праектах і макетах, распрацоўцы дэталяў на графічным планшэце, а заканчваецца рэалізацыяй машыннай вышыўкі. Жаночае адзенне на 95 % складаецца з эка-матэрыялу, высакаякаснага лёну і вышыўкі ў сучасным бачанні, прапануецца пад дэвізам – «Беларусам быць модна». Да стварэння адзення нацыянальнай тэматыкі аўтара падштурхнуў удзел у Рэспубліканскім свяце паэзіі, песні і народных рамёстваў «З адною думкаю аб шчасці Беларусі», якое прайшло ў в. Вязынка (2012) і было прысвечана 130-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Для ўдзелу ў свяце была распрацавана калекцыя з тэматычнымі касцюмамі.

У 2020 г. Г.-М. Эгліт стварыла калекцыю «Маланка» ў колькасці 70 аўтарскіх адзінак, асноўнай ідэяй яе было перадаць хуткасць жыцця, у якім важна прыслухоўвацца да свайго сэрца і ўмець знаходзіць шчаслівыя моманты.

Такім чынам, можна заўважыць, што беларускі традыцыйны касцюм – гэта эталон стылю і эстэтыкі. На сучасным этапе развіцця постфальклору ў маладзёжным сацыякультурным асяроддзі назіраецца працэс станаўлення і развіцця фальклорнага мастацтва ў аўтэнтычнай першароднай форме. Успрымаючы сцэнічны вобраз, глядач можа далучыцца да культуры народа, адчуць дух часу і захаваць у памяці ўяўленне аб нацыянальным строі, што з'явіцца імпульсам для наступнага звароту да першакрыніц, паспрыяе самаадукацыі і самаразвіццю ў вобласці традыцыйнай культуры. Зварот да этнічнага стылю мае мэтай не падрабязнае аднаўленне традыцыйных форм нацыянальнага касцюма, а стварэнне на яго аснове ідэі новага вобраза ў гармоніі з цяперашнім грамадствам.

*1.* Ансамбль танца, музыки и песни «Талака» [Электронный ресурс] // Витебская областная филармония : офиц. сайт. – Режим доступа: https://vitebsk-fil.by/ispolniteli/ansambl-tanca-muzyki-i-pesni-talaka. – Дата доступа: 20.11.2021.

*2.* Белорусский национальный костюм [Электронный ресурс] // Словари и энциклопедии на Академике. – Режим доступа: https://dic.academic.ru/dic.nsf/ruwiki/1744526. – Дата доступа: 22.10.2021.

*3. Вайцяхоўская, Т. У.* Беларускі аўтэнтычны касцюм у сучаснай сцэнічнай практыцы [Электронный ресурс] / Т. У. Вайцяхоўская // БГУКИ : офиц. сайт. – Режим доступа: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/2685/BELARUSK%d0%86%20A%d0%8eTE%27NTYICHNYI%20KASCYUM%20U%20SUCHASNAY%20SCE%27N%d0%86CHNAY%20PRAKTYICYI.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Дата доступа: 20.11.2021.

*4.* Выбор творческого источника [Электронный ресурс] / Разработка коллекции женской молодежной одежды с отделкой авторской работы // Студенческая библиотека онлайн (studbooks.net). – Режим доступа: https://mobile.studbooks.net/2524001/tovarovedenie/vybor_tvorcheskogo_istochnika. – Дата доступа: 15.11.2021.

*5.* Народная группа «Гуда» [Электронный ресурс] // БГУКИ : офиц. сайт. – Режим доступа: http://buk.by/creative-activity/arts-groups/folk-group-guda/index.php?sphrase_id=16067. – Дата доступа: 17.11.2021.

*6.* Показ авторской коллекции сценических костюмов! [Электронный ресурс] // Белорус. гос. мед. ун-т : офиц. сайт. – Режим доступа: https://www.bsmu.by/page/3/3589/. – Дата доступа: 21.10.2021.